Главное Грамадства

Ромкаў тата самы смелы

23/01/2018 1318 redakcyja 0 Comment



У чарговы раз ён аналізуе падзеі мінулага чацвярга і пераконваецца: усё зрабіў, як вучылі ў акадэміі. 18 студзеня ўчастковы інспектар Ляхавіцкага РАУС Яўгеній Вайшэвіч працаваў на сваім участку ў

25 ФЕВРАЛЯ 2024 ГОДА ЕДИНЫЙ ДЕНЬ ГОЛОСОВАНИЯ

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ



Начаўскім сельсавеце: у вёсцы Мыслабаж планаваў пабываць у некаторых сем'ях. У 13 гадзін 48 мінут ад дзяжурнага РАУС паступіла паведамленне аб пажары ў Гаслаўшчыне. На службовым УАЗе за 7 мінут дамчаў да месца здарэння. Далей падзеі разгортваліся нібы ў прыгодніцкім фільме.

– У 13.55 быў каля ахопленага дымам дома №4 па вуліцы Маладзёжнай. Уключыў гукавы сігнал на машыне для апавяшчэння. На вуліцы мітусілася і клікала на дапамогу гаспадыня. Упэўніўся, што ў памяшканні не было людзей. Паколькі вада ў доме перамерзла, вырашыў тушыць агонь снегам. Адразу на дапамогу прыбег сусед пацярпелых Андрэй Асаскала і яшчэ адзін незнаёмы мужчына.
Снегам мы засыпалі ўвесь пакой, дзе знаходзіўся кацёл паравога ацяплення. Хутка з Тальмінавічаў прыбылі выратавальнікі, – успамінае старшы лейтэнант міліцыі. – Да іх прыезду ўдалося амаль поўнасцю збіць полымя.

Усе дзеянні Яўгенія Вайшэвіча па ліквідацыі пажару – прафесіянальныя. Каб не ўчастковы і яго памочнікі, пашкоджанні былі б куды большыя, – гаворыць першы намеснік начальніка РАНС Сяргей Гатоўчыц.
Сам Яўгеній нічога надзвычайнага ў сваім учынку не бачыць:
– Зрабіў тое, што і павінен быў. Галоўнае, абышлося без ахвяр. На маім месцы, думаю, так паступіў бы кожны, тым больш міліцыянер.
– Адказны, надзейны, перспектыўны супрацоўнік. Актыўна займаецца прафілактычнай работай па папярэджанні правапарушэнняў, – характарызуе ўчастковага першы намеснік начальніка РАУС Андрэй Гіль. Тое, што будзе міліцыянерам, Яўгеній ведаў яшчэ падлеткам. Ён – адзін з дзясятка выпускнікоў Крывошынскай СШ, хто прадоўжыў вучобу ў Акадэміі МУС. На службу ў Ляхавіцкі РАУС прыйшоў у 2013 годзе, працаваў оперупаўнаважаным аддзялення крымінальнага вышуку, цяпер на ўчастку.
– Участковы – гэта той, хто дапамагае. Галоўным у рабоце лічу кантакт з насельніцтвам, уважлівасць і неабыякавасць да праблем іншых, – гаворыць Яўгеній Вайшэвіч.
... Дома пасля вогненнага здарэння ён спачатку нічога не расказваў пра свой учынак. Аднак, выдалі абгарэлыя флікер і пагон на форме. Жонцы нешматслоўна патлумачыў: гарэў дом, тушыў пажар. І з задавальненнем пасадзіў сабе на калені сына – Ромку 11 месяцаў, ён вельмі любіць тату. Дарэчы, цяпер Яўгеній Вайшэвіч мае поўнае права святкаваць і Дзень выратавальніка, напярэдадні якога ён змагаўся з агнём.

Галіна КАНЬКО.

Фота Сяргея ВАРАНОВІЧА.







«ШКОЛЬНЫ ДЗЁННІК»



РЭКЛАМА



одноклассники



← Малочнае крэда

Ода жывёлаводу →

Вам также понравится



Чалавек з ружжом

23/09/2016 0



На сувязі – БРСМ і не толькі. БРСМ арганізаваў работу гарачых тэлефонных ліній для інфармацыйнай дапамогі пажылым людзям

25/03/2020 0



Наша Даша і цымбалы

26/05/2017 0



Видеоканал "Ляховичи и ляховичане". События, люди, мнения





Добавить комментарий

Ваш e-mail не будет опубликован. Обязательные поля помечены *

Комментарий

Имя *

E-mail *

Сайт

Отправить комментарий



Президент Республики Беларусь

БРЕСТСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

ЛЯХОВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

НАШИ ЦЕЛИ

ЦЕЛИ устойчивого развития в БЕЛАРУСИ

У аддзела рэкламы «ЛВ»
новы нумар тэлефона
6 09 08

Навіны БелТА

Опросы

Достаточно ли озеленён город? Устраивает ли качество городского озеленения?

- [ ] да, озеленён достаточно, посадки ухожены
- [ ] да, озеленён достаточно, но посадки недостаточно ухожены
- [ ] нет, озеленён недостаточно, но посадки ухожены
- [ ] нет, озеленён недостаточно, посадки недостаточно ухожены

Голос

Просмотреть результаты

Каких видов зелёных насаждений, на ваш взгляд, не хватает в городе?

- [ ] газонов
- [ ] цветников и клумб
- [ ] кустарников
- [ ] деревьев
- [ ] ваш вариант

Голос

Просмотреть результаты

Вы готовы принять участие в благоустройстве и озеленении города?

- [ ] да
- [ ] нет
- [ ] не знаю/ затрудняюсь ответить

Голос

Просмотреть результаты

Ляхавіцкі край вачамі патэнцыяльнага турыста



Наш архіў

Выберите месяц

Рубрыкі сайта

Выберите рубрику

Урачэбная кансультацыя



Каляндар

Февраль 2024

Пн	Вт	Ср	Чт	Пт	Сб
« Янв					

Пн	Вт	Ср	Чт	Пт	Сб
			1	2	3
5	6	7	8	9	10
12	13	14	15	16	17
19	20	21	22	23	24
26	27	28	29		
« Янв					











Каментарыі

Елена к записи «Ляхавіцкі веснік» аб’явіў конкурс, дзе ў галоўнай ролі — … ведзьмачка

Елена к записи У саюзе з друкам. Гэтымі днямі Белсаюздрук адзначае стогадовы юбілей

Читать и ещё раз читать к записи Яркі падарунак



Надвор`е ў Ляхавічах





Ляхавічы на карце



Карта сайта

Галоўная

РУБРЫКІ

- У цэнтры ўвагі
- Единый день голосования
- Навіны
- Грамадства
- Памяць сэрца
- Калонка рэдактара. Думкі ўслых
- Сельская гаспадарка
- Тэма тыдня
- Спорт
- Культура
- Адукацыя
- Служба 101
- ДАІ інфармуе
- Здарэнні

При перепечатке материалов гиперссылка на сайт http://www.lves.by/ обязательна
Копирайт © 2024 Ляховичи. Ляховичский вестник. Ляхавіцкі веснік. Новости города Ляховичи Брестской области. Все права защищены.

